его целостности и полноте, в его наиболее естественном и нормальном состоянии, учится воздействовать на действительность с тем, чтобы она стала наиболее совершенной не только в эстетическом, но и в практическом отношении. В процессе такого воздействия человек сам становится совершенным, гармоничным, прекрасным человеком. В силу этого эстетика как наука занимает ведущее место в деле воспитания человека — человека демократического общества.

И.В.ДАВЫДЗЕНКА, дацэнт
/Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт/

## НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ЯК СРОДАК УДАСКАНАЛЬВАННЯ ЗМЕСТУ НАВУКОВАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

Ва ўмовах рэалізацыі курса на незалежность Рэспублікі Беларусь, ажыццяўлення працэсаў нацыянальна-культурнага адраджэння беларускага народа асабліва ўзрастае роля вывучэння гісторыі, бо толькі ўсебакова адукаваны чалавек з высокім узроўнем агульнай культуры можа знайсці новыя нетрадыцыйныя рашэнні эканамічных праблем ва ўмовах рынку. Хуткасць, нестандартнасць мыслення эканамістаў будуць вызначацца не столькі аб'ёмам вузкапрафесійных ведаў, колькі эрудыцыяй, шырынёй кругагляду.

Універсітэт у комплексе вырашае задачы ўсебаковай падрыхтоўкі спецыялістаў. Для найбольш эфектыўнай падрыхтоўкі неабходна шчырая зацікаўленасць студэнтаў у навуковай працы.

Навуковая праца студэнтаў, да якой іх заахвочваюць выкладчыкі, ажыццяўляецца на кафедры эканамічнай гісторыі ў розных формах, у тым ліку і ў форме навуковых канферэнцый.

Канферэнцыі даюць магчымасць пашырыць веды, ахапіць усе з'явы, пранікнуць у сутнасць праблемы. Студэнты выступаюць з дакладамі на дастаткова высокім узроўні, і ўдзельнікі канферэнцыі атрымліваюць інфармацыю па формуле I + усе, што немагчыма пры звычайнай пабудове вучэбнага працэсу з-за абмежаванасці часу.

Праграма па эканамічнай гісторыі Беларусі і замежных краін уключае вывучэнне эканамічных рэформаў, станаўленне і развіццё банкаўскай сістэмы Рэспублікі Беларусь, грашовае абарачэнне, развіццё гандлю і іншыя вузлавыя праблемы эканомікі.

З пункту гледжання эканомікі кадзвычай актуальнай праблемай з'яўляецца новая эканамічная палітыка. На навукова-практычнай

канферэнцыі "Развіццё гандлю Беларусі ва умовах НЭП" студэнты падрабязна выявілі, якія змяненні унесла новая эканамічная палітыка у сферу гандлю, пры гэтым пераканаўча паказалі вынікі пошуку дзяржавай якасна новых формаў кіравання гандлем.

У наш час, калі у рэспубліцы пачынаецца развіццё розных формаў уласнасці, дробнага і сярэдняга бізнесу, вялікае значэнне мае вывучэнне вопыту развітых капіталістычных краін. На канферэнцыі "Актуальныя праблемы камерцыйнай дзейнасці малых прадпрыемстваў, гісторыя іх станаўлення і развіцця" былі раскрыты некаторыя праблемы камерцыйнай дзейнасці малых прадпрыемстваў у ФРГ, прычыны узмацнення іх ролі у эканоміцы. Пры абмеркаванні гэтых пытанняў студэнты высветлілі, што такія працэсы звязаны са зрухамі у прадукцыйных сілах грамадства, з нават дэмаграфічнай структурай занятасці, з ростам сферы паслуг. Былі прыведзены цікавыя даныя па эфектыўнасці выкарыстання малога бізнесу у сацыяльнай сферы, вызначаны станоўчыя вынікі малога прадпрымальніцтва для сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна.

На аснове фактычных даных, якія прыводзяцца на канферэнцыях, магчыма не толькі паўнацэннае асэнсаванне існуючай рэчаіснасці, але і прагназіраванне развіцця эканомікі у будучым. Найбольш цікавыя праблемныя пытанні выносяцца на агульнаўніверсітэцкія і рэспубліканскія навуковыя канферэнцыі. Атрыманыя студэнтамі веды, навыкі і уменні з'яўляюцца надзвычай важнымі для будучых эканамістаў-кіраўнікоў.

П.І.РОГАЧ, дацэнт
/Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт/

## ПРА АСНОЎНЫ ЗМЕСТ КУРСА "КРАІНАЗНАЎСТВА"

Падрыхтоўка студэнтаў па новых спецыяльнасцях, якія раней адсутнічалі у нашым універсітэце, запатрабавала распрацоўкі і новых вучэбных планаў. У іх уключаны не толькі традыцыйныя вучэбныя дысцыпліны, такія як вышэйшая матэматыка ці эканамічная тэорыя, але і зусім новыя. Да іх адносіцца такі прадмет, як краіназнаўства, што выкладаецца для спецыяльнасцяў "Камерцыйная дзейнасць на рынку паслуг /турызм/" і "Дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраванне". Таму хацелася б спыніцца на той спецыфіцы, якая павінна прысутнічаць у гэтым курсе для кожнай вышэйназванай спецыяльнасці.